ты с архивными материалами показывает, что мы сейчас находимся если и не в начальной фазе, то лишь на пути к их полной научной разработке.

1. Анищенко, Е. К. Черта оседлости: Белорусская синагога в царствование Екатерины II / Е. К. Анищенко. – Минск : Арти-Фекс, 1998. – 160 с.
2. Клиер, Дж. Д. Россия собирает своих евреев: Происхождение еврейского вопроса в России. 1772–1825 / Дж. Д. Клиер. – М. : Мосты культуры; Иерусалим: Гешарим, 2000. – 352 с.
3. Минкина, О. Ю. «Сыны Рахили»: Еврейские депутаты в Российской империи. 1772–1825 / О. Ю. Минкина. – М. : Новое литературное обозрение, 2011. – 344 с.
4. «Московское изгнание» евреев 1790 года / публ. Д. З. Фельдмана // Вестник Еврейского университета в Москве. – 1996. – № 1(11). – С. 170–195.
5. Российский государственный архив древних актов: Путеводитель. – М. : Археографический центр, 1999. – Т. 4. – 782 с.
6. Фельдман, Д. З. Первые еврейские предприятия Российской империи: Архивные источники по Белоруссии / Д. З. Фельдман // Евреи Беларуси: История и культура : сб. статей. – Минск : Четыре четверти, 2000. – Вып. V. – С. 21–37.
7. Фельдман, Д. З. Первые российские штадланы: витебский купец Цалка Файбишович / Д. З. Фельдман // Архив еврейской истории. – М. : РОССПЭН, 2004. – Т. 1. – С. 75–88.
8. Фельдман, Д. З. Роль и деятельность еврейского купечества России в последней трети XVIII в. (по материалам РГАДА) / Д. З. Фельдман // Торговля, купечество и таможенное дело в России в XVI–XVIII вв. : сб. материалов Международной научной конференции (Санкт-Петербург, 17–20 сентября 2001 г.). – СПб. : Изд-во С.-Петерб. ун-та, 2001. – С. 207–213.
9. Центральный государственный архив древних актов СССР : путеводитель. – М. : Главархив СССР, 1991. – Т. 1. – 528 с.
10. Центральный государственный архив древних актов СССР : путеводитель. – М. : Главархив СССР, 1992. – Т. 2. – 516 с.

**Анофранка Н.В.**

## КРЫНІЦЫ ВЫВУЧЭННЯ САЦЫЯЛЬНА-ПРАВАВОГА СТАТУСА І ГРАМАДСКАЙ АКТЫЎНАСЦІ ДВАРАНАК БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯЎ КАНЦА XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст.

Спецыфіка базы крыніц абумоўлена вузкасцю і складанасцю прадмета даследавання. Паколькі комплексныя дакументы па дадзенай тэме цалкам адсутнічаюць у архівах, звесткі прыходзілася збіраць па крупіцах (асобныя сказы ў дакументах, фрагментарныя згадкі, пасылы і г.д.). Тым не менш спектр прааналізаваных дакументаў базіруецца на пісьмовых крыніцах, якія захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (НГАБ): фонд 136 (Мінская духоўная кансісторыя), фонд 295 (Канцылярыя Мінскага грамадзянскага губернатара), фонд 320 (Канцылярыя Мінскага губернскага прадвадзіцеля дваранства), фонд 1297 (Канцылярыя Віцебскага, Магілёўскага і Смаленскага генерал-губернатара), фонд 1430 (Канцылярыя Віцебскага грамадзянскага губернатара), фонд 2001 (Канцылярыя Магілёўскага грамадзянскага губернатара); у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродна (НГАБ у Гродна): фонд 1 (Канцылярыя гродзенскага губернатара), фонд 2 (Гродзенскае губернскае праўленне), фонд 6 (Гродзенская канцылярыя грамадскіх спраў цэсарэвіча – галоўнакамандуючага літоўскім асобным корпусам). Таксама выкарыстаны дакументы Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі (Санкт-Пецярбург) – фонд 629 (В.Ф. Ратч); Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва (Санкт-Пецярбург): фонд 733 (Дэпартамент народнай асветы Расійскай імперыі), фонд 1266 (Камітэт Заходніх губерняў); дакументы Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве (Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie): імянныя фонды (архіў Тызенгаўзаў, архіў Ганны Вансовіч, архіў Патоцкіх з Яблоні), а таксама архіў масонскі і збор матэрыялаў Мінскага кола Варшаўскага таварыства апекі над здабыткамі мінуўшчыны (1804–1908).

Выкарыстаны комплекс можна падзяліць на дакументальныя і наратыўныя (апавядальныя) крыніцы. Дакументальныя крыніцы не з'яўляюцца аднароднымі, у іх аб'ектыўна вылучаюцца падгрупы: дакументы афіцыйнага справаводства, судова-следчая дакументацыя, заканадаўчыя акты. У корпус дакументаў афіцыйнага справаводства ўваходзяць: 1) распараджальныя дакументы (арганізацыйна-кіраўнічыя распараджэнні і распараджэнні прыватнага парадку), 2) справаздачныя дакументы, 4) дзелавая перапіска, 3) прасіцельныя дакументы. Корпус судова-следчых дакументаў складаюць: 1) прашэнні, 2) дакументы допытаў, 3) распараджэнні на заключэнне следчых органаў.

Найбольш значную частку складаюць распараджальная і справаздачныя дакументацыя, а таксама дзелавая перапіска. Асаблівасцю гэтага корпуса дакументаў з'яўляецца тое, што яны прадстаўлены ад самага ніжэйшага да самага вышэйшага ўзроўню расійскай адміністрацыі. У значнай ступені такія дакументы датычыліся жаночай адукацыі на беларускіх землях [15]. Іх аналіз дае магчымасць вызначыць палітыку расійскай адміністрацыі ў дачыненні да манастырскіх і свецкіх жаночых навучальных устаноў краю, прасачыць змены ў палітыцы



Рэпазіторый БДУ

расійскага ўраду ў адносінах да жаночай адукацыі у беларуска-літоўскіх губернях на працягу першай паловы XIX ст.

Важную ролю справаздачныя дакументы і дакументы дзелавой перапіскі адыгралі пры аналізе грамадска-палітычнага становішча дваранак беларускіх губерняў. Гэта дакументы, якія датычыліся кантролю за добранадзейнасцю дваранак [11], усталяваннем за імі паліцэйскага нагляду [13, спр. 2967]. Аналіз гэтай катэгорыі дакументаў дазволіў прасачыць змены ў стаўленні расійскіх улад да жаночай палітычнай актыўнасці ў пэўны перыяд.

У адрозненні ад справаздачнай, распараджальнай дакументацыі і дзелавой перапіскі, якія ствараліся мужчынамі, прасіцельная дакументацыя (прашэнні, скаргі) на адрас шматлікіх інстанцый пісалася як мужчынамі, так і жанчынамі. Таму прашэнні і скаргі з'яўляюцца крыніцамі па высвятленні фактычнага статусу жанчын [14]. Большая іх колькасць раскрываюць статус дваранак у шлюбна-сямейнай сферы [4]. Гэтыя дакументы дазволілі выявіць спецыфіку рэгулявання сямейных адносін на беларускіх землях у першай палове XIX ст., вызначыць функцыі свецкай і царкоўнай улады ў вырашэнні сямейных канфлікатаў. Аналіз прасіцельнай дакументацыі даў магчымасць выявіць тыя праблемы, якія дваранкі імкнуліся вырашыць пры дапамозе афіцыйных устаноў. Таксама прашэнні мелі важнае значэнне пры разглядзе праблемы развіцця жаночай адукацыі. Перш за ўсё гэта прашэнні дваран і дваранак аб залічэнні іх дачок у казённыя навучальныя ўстановы [13], інстытуты высакародных дзяўчын [12]. Аналіз гэтых дакументаў дазволіў выявіць попыт на жаночую адукацыю, вызначыць спецыфіку размеркавання дзяўчынак-дваранак па розных навучальных установах. Прашэнні з боку жанчын на дазвол адкрыць прыватную навучальную ўстанову і займацца педагагічнай і адукацыйнай дзейнасцю [13, спр. 3579] паказваюць сацыяльную актыўнасць дваранак і ўцягванне іх у сферу прафесійнай дзейнасці.

Асобна трэба вылучыць прашэнні аб выдачы дваранкам пасведчанняў пра няўдзел у паўстанні 1831 г. [7], аб памілаванні сваякоў [8], адносна канфіскацыі маёмасці за ўдзел мужоў і сыноў у паўстанні 1830–1831 гг. і ў палітычных арганізацыях [5, спр. 1627]. Гэты від дакументаў дапамог прасачыць рэакцыю жанчын на рэпрэсіўныя дзеянні з боку ўлады, а таксама выявіць тыя спосабы, пры дапамозе якіх яны імкнуліся абараніць сябе і свае сем'і, захаваць маёмаснае становішча.

Судова-следчая дакументацыя часцей за ўсё характарызуе сферу шлюбна-сямейных адносін: заключэнне [9] і скасаванне шлюбу [10], злачынствы супраць сужэнца ці супраць «свяшчэннага шлюбу» [10, спр. 7865], пытанні веравызнання дзяцей [13, спр. 6675]. Судова-следчыя дакументы з'яўляліся важнымі крыніцамі пры аналізе палітычнай актыўнасці жанчын. Большасць з іх узнікла пасля паўстання 1830–1831 гг. і сведчыць аб тым, што жанчыны падазраваліся ў непасрэдным удзеле ў паўстанні і дапамозе паўстанцам [5]. Таксама дваранкі падазраваліся ў нядобранадзейных думках і распаўсюджванні нелегальнай літаратуры, у выніку чаго яны траплялі пад паліцэйскі нагляд [6]. Жанчыны ў меншай ступені чым мужчыны абвінавачваліся як дзяржаўныя злачынцы, аднак сустракаліся і такія выпадкі [1]. Да судова-следчых дакументаў можна аднесці і тыя, што датычыліся канфіскацыі і секвестравання маёмасці па палітычных матывах [8, спр. 138].

Корпус заканадаўчых дакументаў у асноўным прадстаўлены апублікаванымі крыніцамі: Статут ВКЛ (1588 г.), Свод законов Российской империии, [повелением Государя императора Николая Первовго составленный]. – Санкт-Петербург, 1857. (Т. 10. – Ч. 1: Законы гражданские, Т. 11: Уставы духовных дел иностранных исповеданий), Закон о браке (Prawo cywilne obowiązujące w Krolewstwie Polskim : w 3 t. – Warszawa : druk Józefa Zawadzkiego. – 1860. – T.1. Prawo o małżeństwie). Пераважна выкарыстаны асобныя артыкулы з гэтых заканадаўчых збораў, а таксама распараджэнні імператараў, Св. Сінода і Сената, якія змешчаны ў «Полное собрание Законов Российской империи / С 1649 по 12 декабря 1825 года: в 45-ти т. – СПб.: Типография II Собственной ЕИВ канцелярии, 1830. – Т. 1–45» і «Полное собрание Законов Российской империи. Собрание второе / С 1825 по 1881 гг. СПб.: Типография II Собственной ЕИВ канцелярии, 1840–1884. – Т. 1–55». Гэты від дакументаў даў магчымасць выявіць механізмы дзяржаўнага рэгулявання прававога статусу дваранак, іх правы і абавязкі ў сямейнай сферы.

У асобную групу вылучаюцца апублікаваныя крыніцы, якія датычацца ўдзелу дваранак у дабрачыннай дзейнасці і змяшчаюцца ў зборніках дакументаў «Dzieje dobroczynności krajowej i zagraniczniey» за 1820, 1821 і 1823 гг. У зборніках прадстаўлены праграмы, статуты, справазда-



Рэпазіторый БДУ

чы дабрачынных арганізацый, у тым ліку і жаночых. Змяшчаюцца шматлікія абвесткі пра дабрачынныя канцэрты і відовішчы, публічныя падзякі жанчынам, якія прымалі актыўны ўдзел у дабрачыннасці. Гэтыя дакументы дазволілі выявіць асноўныя формы жаночай свецкай дабрачыннасці.

Корпус наратыўных крыніц прадстаўлены галоўным чынам апублікаванымі мемуарамі і ўспамінамі як жаночымі [3; 16; 17; 18; 19], так і мужчынскімі [2; 18]. Часцей гэты від крыніц выкарыстоўваўся пры разглядзе адукацыі і грамадска-палітычнай актыўнасці дваранак з канца XVIII да пачатку 30-х гг. XIX ст. Гэта тлумачыцца тым, што да пачатку 30-х гг. XIX ст. такая жаночая актыўнасць мала адлюстроўвалася ў афіцыйных дакументах. У той жа час, наратыўныя дакументы, не будучы аб'ектыўнымі гістарычнымі крыніцамі, выкарыстоўваліся ў спалучэнні з іншымі дакументамі.

Такім чынам, выяўленыя і выкарыстаныя крыніцы дазволілі прасачыць змены ў становішчы жанчын у тых сферах, праз якія дзяржаўная ўлада магла рэгуляваць іх сацыяльна-прававы статус і кантраляваць грамадска-палітычную актыўнасць. У той жа час, устаноўлена, што дакументальныя крыніцы айчынных і замежных архіваў, нават пры адсутнасці асобных фондаў і калекцый, даюць магчымасць: выявіць механізмы рэгулявання сацыяльнага статусу дваранак, паказаць жаночую частку дваранскага саслоўя як аб'ект дзяржаўнага клопату і дзяржаўнай палітыкі, вызначыць формы грамадскай і палітычнай актыўнасці жанчын; паказаць іх як удзельніц сацыяльна-палітычных парцэсаў і падзей.

1. Аддзел рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі. – Фонд 629. Спр. 80.
2. За вольнасць і веру. Ігнацій Клюкоўскі і яго ўспаміны аб падзеях паўстання 1830 – 1831 гадоў : на польскай і беларускай мовах / Уклад., перакл., камент. В.В. Гарбачова. – Мінск : Лімарыўс, 2007. – 120 с.
3. Записки графини Потоцкой (1810–1820). – СПб. : В.В. Комаров, 1901. – 34 с.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) у Гродна. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 372.
5. НГАБ у Гродна. – Ф. 1. Воп. 4. Спр. 119.
6. НГАБ у Гродна. – Ф. 1. Воп. 19. Спр 1627.
7. НГАБ у Гродна. – Ф. 2. Воп. 3. Спр. 1874.
8. НГАБ у Гродна. – Ф. 4. Воп. 1. Спр. 77.
9. НГАБ у Гродна. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 156.
10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 6159.
11. НГАБ. – Ф. 320. Воп. 1. Спр. 156.
12. НГАБ. – Ф. 320. Воп. 3. Спр. 72.
13. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 1522.
14. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 121.
15. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. – Ф. 733. Воп. 62. Спр. 143.
16. Шуазель-Гуффье С. де. Исторические мемуары об императоре Александре и его дворе / Вступит, статья А. А. Кизеветтера. – Пер. с франц. З. Мирович. – М. : К. Ф. Некрасов, 1912. – 275 с.
17. Felińska, E. Pamiętniki z życia Ewy Felińskiej : w 3 t. / Ewa Felińska. – Wilno : Józefa Zawadskiego, 1856–1858.
18. Frank, J. Pamiętniki d-ra Józefa Franka profesora Uniwersytetu Wileńskiego: w 3 t. / J. Frank. – Wilno : druk Józefa Zawadzkiego, 1913. – T. 2. – 132 s.
19. Puzynina, G. W Wilnie i w dworach litewskich. Pamiętnik z lat 1815–1843 / Wyd. Adam Czartkowski, Henryk Mościcki. – Wilno : drukiem Józefa Zawadskiego. – Kraków : Krajowa agencja Wydawnicza, 1990. – 389 s.

**Посохов С.И.**

## «АКТОВЫЕ РЕЧИ» ПРОФЕССОРОВ РОССИЙСКИХ УНИВЕРСИТЕТОВ ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ XVIII – ПЕРВОЙ ТРЕТИ XIX в. КАК ИСТОРИЧЕСКИЙ ИСТОЧНИК И ПАМЯТНИК КУЛЬТУРЫ

Важной формой саморепрезентации университетов Российской империи стали так называемые «актовые речи», которые регулярно читались профессорами в торжественные для университета дни и которые являлись частью университетских ритуалов, причем, в данном случае, ритуала весьма давнего [5, с. 61]. Эти речи были довольно стереотипными, в них немало «общих мест», некоторые из них не без оснований называются в литературе «панегириками», где «единогласно славились правление и все мудрые учреждения» монарха [16, с. 242]. Возможно, поэтому они не особенно привлекали интерес исследователей. Вместе с тем, нередко именно таким образом ораторы формировали новый взгляд не только на монарха (конечно, «просвещенного»), но и на задачи общества. При внимательном прочтении эти речи дают интересный материал для характеристики процесса утверждения новых культурных ценностей в местной среде [см.: 6]. Эти речи публиковались, и сегодня они значатся среди ценнейших изданий университетских библиотек.



Репозиторий ВГУ